**Э. А. Мурзіч**

# ЭТЫЧНАЯ І ЭСТЭТЫЧНАЯ АПАЗІЦЫЯ ГАЛОЎНЫХ ГЕРОЯЎ АПОВЕСЦІ «ХАМ» ЭЛІЗЫ АЖЭШКІ

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*elka.karamelka@yandex.by;*
*навук. кір. – У. Г. Кароткі, канд. філал. навук, дац.*

У артыкуле разглядаецца аповесць «Хам» Элізы Ажэшкі (1841–1910), напісаная ў 1888 годзе. Вызначаюцца этычныя і эстэтычныя ідэалы галоўных герояў твора – рыбака Паўла Кабыцкага і гараджанкі Франкі. Праводзіцца аналіз характараў, паводзінаў і ўчынкаў персанажаў на працягу трох перыядаў сюжэта: знаёмства Франкі і Паўла, іх побыт да ўцёкаў жанчыны, жыццё Паўла без Франкі і іх сумеснае існаванне пасля вяртання гераіні. Праводзіцца супастаўленне этычных і эстэтычных ідэалаў галоўных герояў. У выніку даследавання аспрэчваецца меркаванне вучоных мінулага стагоддзя, якія ставіліся да Франкі і Паўла як да тыпізаваных, а не індывідуалізаваных, вобразаў. Як правіла, Павел – станоўчы персанаж, а Франка – адмоўны.

***Ключавыя словы:*** этычны ідэал; эстэтычны ідэал; рысы характару; сацыяльныя ўмовы; сямейнае жыццё.

Аповесць «Хам» вылучаецца сярод усёй творчасці Элізы Ажэшкі дзякуючы выразнай псіхалагічнасці ў апісанні характараў і ўчынкаў галоўных герояў – Паўла Кабыцкага і Франкі. Даследчыкі мінулага стагоддзя ставіліся да персанажаў як да тыпізаваных вобразаў. Мэта дадзенага даследавання – даказаць неадназначнасць вобразаў галоўных герояў. Аналіз этычных і эстэтычных ідэалаў герояў праводзіўся на базе трох перыядаў сюжэта аповесці «Хам»: знаёмства Франкі і Паўла, іх сямейнае жыццё да ўцёкаў гераіні і пасля яе вяртання.

Першы перыяд дазваляе нам даведацца пра мінулае галоўных герояў і сканструяваць іх ідэалы да таго, як героі пачнуць уплываць адно на аднаго. Павел Кабыцкі – рыбак, па паходжанні – селянін. Жыў адасоблена ад людзей, але заўсёды дапамагаў суседзям. Амаль увесь год герой рыбачыў, а на парады ажаніцца адказваў: «Неба – мая хата, а рака – жонка» [1, с. 262]. Можна зрабіць вынік, што шчасце для Паўла да жаніцьбы з Франкай заключалася ў спакойным аднастайным жыцці.

Франка – пакаёўка паноў, па паходжанні – мяшчанка. Ужо пры першым знаёмстве бачна ганарлівасць і самаўпэўненасць галоўнай гераіні: «Хай

толькі мяне хто-небудзь абразіць злым словам, дык я яму так адкажу, што дзесяць год будзе помніць!» [1, с. 264].

Важны намёк на рысы характару Франкі Эліза Ажэшка робіць у наступных рэмарках: «Відаць, што за чалавекам, які ёй (Францы – Э. М.) спадабаўся, за новымі ўражаннямі і забавамі жанчына гэта гатова была паляцець хоць на край свету…» [1, с. 268]. Насцярожвае чалавек, для якога сэнсам жыцця з'яўляюцца забавы і новыя ўражанні.

Франка ставіцца грэбліва як да паноў, на якіх працуе, так і да мужыкоў. На паноў яна пакрыўджана якраз за тое, што ёй прыйшлося на іх працаваць, а знявагу да мужыкоў Франка пераняла ад сваіх гаспадароў.

Нельга не пагадзіцца з наступнай заўвагай В. Гапавай: «Яе (Франкі) вобраз пададзены жыццёва, ва ўсёй паўнаце станоўчых і адмоўных рысаў… Яна вымушана прадаваць сваю працу, а прадаваць „каханне“ яе таксама прымусілі і прывучылі. Аднак у яе натуры ёсць і станоўчыя рысы… Па прыродзе яна не злая, а шчырая, дабрадушная, пісьменная» [2, с. 182]. Сапраўды, нельга сказаць, што Франка валодае толькі адмоўнымі якасцямі і супрацьпастаўляецца ў творы «ідэальнаму» вобразу Паўла.

Зыходзячы з першага вылучанага перыяду, можна зрабіць наступныя высновы. Для Паўла Кабыцкага этычны ідэал – гэта чалавек высокамаральны, які чула ставіцца да гора іншых людзей. Для Франкі ж ідэал – той, хто атрымлівае асалоду ад жыцця, чалавек бесклапотны. Прыгожае Павел бачыць у прыродзе, ёй таксама захапляецца і Франка, але пераносіць з'явы прыроды на рэчы матэрыяльныя: кропелькі вады ёй хацелася нанізаць ды зрабіць пацеркі.

У другім перыядзе можна заўважыць, як героі ўплываюць адно на аднаго. Павел Кабыцкі пасля жаніцьбы даволі моцна мяняецца: «…ранейшы спакой Паўла цяпер перайшоў у няспынную гарачую радасць» [1, с. 290]. Шчасце ён знайшоў ва ўласнай сям'і, а сэнсам яго жыцця стала выратаванне душы Франкі. Дзеля гэтага Павел не хоча абцяжарваць яе працай. Гэта адзначае Уладзімір Казбярук: «Разумеючы, што Пронку разбэсцілі ўмовы яе папярэдняга жыцця, Акунь (Кабыцкі – Э. М.) стварае ёй такія абставіны, каб яна магла забыць пра ўсё мінулае. Сам выконвае жаночую і мужчынскую работу…» [3, с. 71].

Галоўнай праблемай Франкі была яе ганарлівасць: жанчына паранейшаму адчувала сябе вышэйшай за суседзяў-сялян. Неаднаразова яна скардзіцца жабрачцы Марцэлі на тое, што апусцілася да жыцця ў асяроддзі хамоў. Пра гэта зноў жа робіць слушную заўвагу У. Казбярук: «Трагедыя

Пронкі заключаецца ў тым, што ў новае жыццё яна прыйшла з усім цяжарам старых забабонных уяўленняў. <…> У сялянскай хаце, яна засталася сабой, чалавекам мяшчанскай маралі» [3, с. 71].

На жаль, сямейнае жыццё захапляе Франку нядоўга. Павел, як чалавек разважлівы і спакойны, не мог забаўляць яе ўвесь час. Таму, калі сыходзіць эйфарыя закаханасці, жанчына заўважае, які яе муж стары і непрывабны, ды з галавой кідаецца ў новае каханне.

Такім чынам, у другім абазначаным перыядзе ідэалы герояў пачынаюць разбівацца аб рэальнасць жыцця. Павел уваходзіць у стан эйфарыі ад кахання, становіцца радасным і ветлівым, аднак потым вяртаецца да больш спакойнага настрою. Франка, з аднаго боку, застаецца смяшлівай, але, з другога – па-ранейшаму не любіць сялян, якіх яна называе хамамі. З цягам часу гэтая нелюбоў толькі ўзмацняецца і прыводзіць да расчаравання ў сямейным жыцці і мужы і, нарэшце, да ўцёкаў з дома.

У трэцім перыядзе адбываецца разбурэнне ўсіх ранейшых поглядаў герояў. Павел ва ўцёках Франкі вінаваціць сябе. «„Як жа гэта? Ганьбіць тую, на грудзях якой мне сніўся залаты сон майго жыцця“ – гаворыць ён сабе. <…> Нічыёй віны тут няма, а калі ёсць, дык толькі мая, а не той, якую асуджаць я не хачу і не магу» [1, с. 324]. Менавіта дзеля выратавання душы Франкі ён пачынае перакройваць сябе і свае прынцыпы.

Франка пасля вяртання быццам бы мяняецца. Яна сапраўды стрымлівае свой характар і вяртаецца дзеля дзіцяці. Разам з тым, гераіня разумее, што Павел заўсёды яе прыме, і не прыйдзецца больш шмат працаваць і мясціцца ў розных каморках.

Між тым, вяртанне было для Франкі самай вялікай памылкай. Сэнс яе жыцця – атрымліваць самыя розныя эмоцыі, а побач с Паўлам ды сынам Актавіянам такое немагчыма. У выніку яна забывае пра сумленне і пачынае сустракацца з братам Піліпа (мужа сястры Паўла – Ульяны). Калі сакрэт становіцца вядомым усім, Павел упершыню падымае на жонку руку. Аднак гэтага Франка, хаця яе віна была відавочная, дараваць мужу не магла. Як адзначае Эліза Ажэшка, «…яна (Франка – Э. М.) лічыла сябе страшэнна, жорстка пакрыўджанай і зняважанай, прагнула помсціць за гэта... Яна жадала поўнай, неабмежаванай, дзікай свабоды» [1, с. 370].

Павел Кабыцкі, нягледзячы на здраду і чужога дзіця, пасля вяртання жонкі з радасцю яе прымае і назірае за тым, як яна „выпраўляецца“. Рыбак прымушае Франку працаваць, спадзеючыся, што гэта, нарэшце, выратуе яе душу. Разам з тым, ён не заўважае нянавісці, якая насуперак усяму ўзрастае

ў жанчыне. За першай здрадай адбываецца другая. Пасля гэтага ён разумее, што яе душа страчана цалкам і апошняе, што застаецца, – падняць на яе руку. Пасля гэтага ўчынку герой плача, расчараваны ва ўсіх этычных ідэалах, якія ў яго былі. «Выбух гневу і рэўнасці <…> апаў, растаў у вялікім, разрываючым грудзі болю, <…> ў крыўдзе за тую чалавечую святую справу выратавання, якая <…> двойчы скончылася нічым» [1, с. 367].

Кульмінацыя твора адбываецца ў момант эмацыянальнага выбуху Франкі, у выніку якога яна падсыпае мужу ў крупнік атруту. Не могуць не здзіўляць паводзіны Паўла, які адкупае Франку ва ўрадніка. Ці можна лічыць гэта добрым учынкам? Канечне, у турме яна б толькі ачарсцвела, але і трымаць яе з сабой ён бы не змог. Франка жа гэта разумее. Яна ідзе на самагубства, не назіраючы іншага выхаду. Жыць адна з дзіцём яна не можа, не можа існаваць і побач з Паўлам.

Такім чынам, можна зрабіць наступныя высновы. Эстэтычны ідэал Паўла – гэта навакольная прырода. Франка таксама бачыць прыгожае ў прыродзе, але не менш важныя для яе рэчы матэрыяльныя: адзежа, знешні выгляд людзей. Апазіцыя этычных ідэалаў відавочная толькі на першы погляд: Павел – сумленны, шчыры чалавек, які робіць усё, каб выратаваць душу жонкі, Франка – чалавек, які імкнецца да новых уражанняў, не зважаючы на маральныя аспекты іх дасягнення. Але праблемы Франкі выходзяць з дзяцінства, сацыяльных умоў, у якіх яна была вымушана расці. А ідэальнасць і святасць Паўла разбураецца аб тое, што ён усё ж такі не змог выратаваць душу Франкі і нават прымяніў фізічную сілу. Якімі б рознымі не былі ідэалы герояў, заканчваюць яны аднолькава – у поўным спусташэнні.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. *Ажэшка Э.* Хам // Аповесці, апавяданні, нарысы; укл. В. Гапавай. Мінск : Беларускі кнігазбор, 2000. С. 261–402.

2. *Гапава В.* Эліза Ажэшка. Жыццё і творчасць / пер. з руск. У. Дамашэвіч. Мінск : Беларусь, 1969.

3. *Казбярук У. М.* Беларуская тэматыка ў польскай рэалістычнай літаратуры. Эліза Ажэшка і беларускі народ // Ступені росту. Мінск : Навука і тэхніка, 1974. С. 42–84.